тэй меры, якая ім падабаецца. І яны нават не падумаюць, што калі б народ сам карыстаў з пладоў сваей работы, дык тыя мільёны гаротнікаў, што цяпер ждуць „панскай ласкі“, самі стварылі б свае культурныя інстытуцыі і ўсё тое, што патрэбна для культурнага жыцьця.

Адвечнае змаганьне ідзе ўва ўсіх народах між тымі двама аснаўнымі станамі. Яно яднае ў вялікую таварыскую сям'ю працоўны люд усіх краёў і ўсіх нацый, яно разьбівае той штучны мур, які вытварыўся між народамі адно затым, што яны гавораць рознымі мовамі, і яно паказвае грамадам працоўнага народу, што ня той вораг, хто так, як і ён, ходзіць у простай шэрай сьвітцы, хоць і чужой мовай гаворыць, а той „свой“ дармаед, апіраючый сваю сілу на цемнаце і забітасьці народу.

У нашым Краю, дзе людзі гавораць ажно чатырма рознымі мовамі, нацыяналісты стараюцца чым больш выкарыстаць гэту розьніцу дзеля таго, каб пасварыць асобныя нацыянальныя групы між працоўным народам і скарыстаць з гэтага дзеля ўмацаваньня эканамічнай залежнасьці сялян і работнікаў ад іх гаспадароў. І трэба прызнацца, што ім гэта ўдаецца ў значнай меры: даволі прыпомніць быўшыя йшчэ так нядаўна — за панаваньня маскалёў — бітвы ў касьцёлах паміж сялянамі з аднэй і тэй жа вёскі[1], каторыя розьняцца адно тым, што часьць адраклася роднай мовы і ламае язык на польскі лад, часьць жа гаворыць па–літоўску. Вось з гэтай прычыны для нашага Краю маюць асаблівую вагу ўсялякія грамадзкія арганізацыі, у каторых поруч працавалі б беларусы і літвіны, палякі і жыды. Спробы закладваць гэткія арганізацыі між так званай інтэлігенцыяй разьбіваліся ў нас кожын раз: *прыпомнім хоць бы сумны канец грамадзянскага камітэту ў Вільні,* каторы, зложаны сьпярша з прадстаўнікоў чатырох нацыянальнасьцей Краю, але зь перавагай палякаў, быў прымушан спыніць сваю работу з прычыны „італьянскай забастоўкі“ польскай большасьці. Затое яны лепей удаюцца і павінны дайсьці свайго ў работніцкіх масах, паміж тымі, хто працай сваей здабывае кусок хлеба. Змаганьне і хлеб — гэта наймацнейшы цэмэнт, каторы павінен зьвязаць у дружную, моцную сям'ю дэмакратычныя элемэнты ўсіх нацый нашага Краю.

І на гэтым грунце ў сталічным горадзе нашага Краю адна за аднэй паўстаюць міжнацыянальныя дэмакратычныя арганізацыі — работніцкія каапэратывы, саюз кватарантаў і іншыя, дзе дружна працуюць беларусы і літвіны, палякі і жыды, разьбіваючы на практыцы работу нацыяналістаў — ворагаў еднасьці ўсіх нацый нашай Бацькаўшчыны.

## Сіла наша — у нас самых

Хто сам сябе не шануе, таго ніхто не ўшануе! — кажа старая народная прыказка. І ў ёй — вельмі многа праўды: гэта мы спазналі на сабе...

Ажно дзіўна сказаць, што беларускі народ, каторы мае 9 мільёнаў сыноў, — значыць, больш, чым Румынія або Баўгарыя, каторыя гэтакае выдатнае месца занімаюць у сусьветнай вайне, — народ гэты так доўга блізка нічым не выяўляў свайго жыцьця. Нашы людзі гэтак ужо прывыклі жыць у няволі, як той вол — хадзіць пад ярмом. І нашаму беларусу ў галаву ня йшла думка, што мы можам жыць неяк іначай — самі сабой, без „апекуноў“, якія сто зь лішкам гадоў мучылі народ, без „апекі“ паноў, каторыя высысалі ўсе сокі з „мужыка“–хлебароба. Мы прывучыліся слухаць чужой каманды: чына з гузікамі, пана вяльможнага — прывыклі цалаваць ім рукі і гнуць перад імі сьпіну да зямлі. І затым то яны глядзяць на заўсёды „пакорнага“ беларуса, як на раба, і для людзей, каторыя нават свае роднай мовы стыдаюцца, маюць толькі пагарду.

Не хватае пачуцьця нацыянальнай гордасьці ня толькі ў цёмных беларускіх сялян: яе няма і ў нашай інтэлігенцыі — у тых людзей, каторыя стаяць на вышэйшых ступенях культуры. Гэта выяўляецца асабліва цяпер, калі палітычны мамэнт стаўляе перад нашым грамадзянствам вельмі сур'ёзныя пытаньні: пытаньне аб палітычнай арыентацыі, аб далейшай будучыні народу і Краю і т. д. Мы ўсё яшчэ шукаем нейкай чужой арыентацыі: то зьвязва-

ем свой быт і сваю долю з маскалямі, то з Польшчай, а тым часам у нас можа і павінна быць толькі адна *свая беларуская, краёвая арыентацыя,* як у маскалёў маскоўская, у палякаў — польская. Мы разумеем, у чым карысьць нашай старонкі, нашага народу, разумеем, што ўжо плясьціся ззаду за чужынцамі нам нягожа; а тым часам колькі нашых інтэлігентаў перш, чым заявіць аб патрэбах Краю, аглядаюцца: а што скажуць у Маскве або ў Варшаве?

Такое становішча ня толькі ня гожа прадстаўнікам дзевяцімільённага народу, але і шкодна для ўсей беларускай справы, для будучыны нашага Краю. У змаганьні за свой быт, за сваю долю выігрываюць толькі сільныя і толькі тыя спаміж сільных, хто сваю сілу знае, пачувае яе ў сабе. Вось нам і трэба ўрэшце зразумець, што ў беларускім народзе захована вялікая сіла, трэба выкінуць нягодную народу палахлівасьць з душы, недавер'е да сябе. Толькі тады, як мы гэта зразумеем, як пачуем у сабе моц нашу, толькі тады зьменіцца прыніжанае палажэньне народу, толькі тады мы здабудзем для сабе належнае нам у роднай зямліцы мейсца.

Памятайма толькі адно: сіла наша — у нас самых.

## Унутраная работа

У той час, як прыйшлі ў наш Край немцы, беларусы апынуліся ў дужа цяжкім палажэньні. Перш–наперш з адходам расейцаў было вывезена або былі прымушаны самі выехаць вельмі многа беларускіх грамадзкіх працаўнікоў, асабліва тыя зь іх, каторыя пражывалі па вёсках і мястэчках, адкуль людзей казакі гвалтам выганялі. Дый і ў Вільні ня шмат іх асталося: было тут многа беларусаў, занімаўшых месцы вучыцялёў сярэдніх школ або быўшых на іншай службе, і вось яны, абмінуўшы ваеншчыну, не абмінулі высяленьня з родных месц. Невялікая грамадка астаўшыхся ў Вільні беларускіх працаўнікоў згуртавалася пасьля адходу расейцаў каля Беларускага Т–ва помачы пацярпеўшым ад вайны. Задачы Таварыства — помач ахвярам вайны — злучылі ўсіх, нягледзячы на рожнароднасьць паглядаў і палітычных кірункаў. На валікі жаль, Т–ва магло выяўляць сваю чыннасьць толькі ў надта малой меры: яно ня мела патрэбных грошы, бо расейскае правіцельства, каторае памагала ўсім нацыянальным таварыствам дзеля помачы пацярпеўшаму ад вайны насяленьню цераз Тацьцянаўскі Камітэт, аб'явіла беларусам байкот і не давала ім ні аднэй капейкі, сыплючы іншым сотні тысяч рублёў. Уся „падмога“, якую Беларускае Т–ва атрымала з расейскіх рук, гэта былі... 360 рублёў! Але і з гэтай драбніцай віленскія беларусы патрапілі пачаць сваю работу: памагаючы сталым людзям толькі ў найбольш цяжкіх прыпадках, віленскі камітэт Беларускага Т–ва зьвярнуў увагу асабліва на найбяднейшых дзяцей беларускіх. 13 лістапада была ў Вільні адкрыта першая беларуская школа–ахронка, у каторай было 36 дзяцей. Бадай, адначасьне, сабраўшы ахвочых людзей за прафэсароў[1], Т–ва адкрыла курсы дзеля падгатоўкі беларускіх народных вучыцялёў[2]. На тых курсах навука была бясплатная, бо і прафэсары давалі сваю працу безь ніякай платы. Пачаўшы вельмі скромна, камітэт ускорасьці здалеў пашырыць сваю работу так, што вясной 1916 году ў Вільні было ўжо цяць беларускіх школ–ахронак, дзе дастае і цяпер навуку, абеды, адзежу, кніжкі да навукі і пісьменныя матэрыялы каля 200 дзяцей. Пры трох школах устроены майстэрні, дзе дзеці вучацца рамясла і ручных работ. Побач з гэтым Камітэт даваў пастаянную помач колькідзесяці сталым асобам у Вільні, а таксама беларускім высяленцам з фронту, каторых разьмясьцілі ў ваколіцах Вільні. За прыкладам Вільні пачалі кратацца беларусы і па другіх месцах. Вясной 1916 году была адкрыта 2–клясная беларуская школа ў Гродні, пасьля пачатковыя школы ў Крынках, у ваколіцах Васілішак і Шчучына, каля Вільні і Падбродзьдзя, а ўвосені адкрылася беларуская вучыцельская сэмінарыя ў Сьвіслачы з трохмесячным курсам[3] і пры ёй прымерная пачатковая школа. У гэту восень быў зроблен і першы выпуск народных вучыцялёў